Упраўленне па адукацыі, спорце і турызме
Дзяржынскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Дзяржынскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства»

# Даведнік маршрутаў паходаў па тэрыторыі Дзяржынскага раёна




**Складальнік:**
**Дым Вольга Віктараўна,**
**метадыст**

**Паштовы адрас**
**222731 вул. Паркавая, 10**
**в. Станькава**
**Дзяржынскі раён,**
**Мінская вобласць**
**тэл. 8(01716) 73374**


Дзяржынск

Дзяржыншчына – самабыты і маляўнічы край з багатай гісторыяй, цікавымі гісторыка-культурнымі помнікамі і помнікамі прыроды. Тут знаходзіцца самая высокая кропка Беларусі – гара Дзяржынская, жывапісны сядзібна-паркавы ансамбль у в.Станькава, Пакроўская царква, касцёл Святой Ганны, гісторыка – краязнаўчы музей у г.Дзяржынску…

Гісторыі яркіх прыкладаў воінскага подзвігу суайчыннікаў (Дзяржыншчына з'яўляецца Радзімай сямі Герояў Савецкага Саюза і поўнага кавалера ордэна Славы), абарончыя баі ў крывавым 1941 годзе, сёстры Хатыні: Любажанка, Літавец, Глухое Пярхурава, гады акупацыі і тая падпольная і партызанская дзейнасць, якая разгарнулася на нашай тэрыторыі.

Сёння Дзяржынскі раён – гэта сучасны, развіты рэгіён Беларусі, які прываблівае людзей сваёй стабільнасцю, непаўторнасцю, жаданнем лепш яго пазнаць.

Мы ганарымся нашай малой радзімай, любім яе і спадзяёмся, што гэту любоў падзеліць з намі кожны, хто хоць аднойчы наведвае нашу гасцінную зямлю.

Вы трымаеце ў руках даведнік турысцкіх маршрутаў для пешых паходаў па тэрыторыі Дзяржынскага раёна. Кожны з іх разлічаны на 2 дні пешага пераходу з рознай насычанасцю гісторыка-культурных і прыродных аб'ектаў для наведвання.

Агульная працягласць чыстага пераходу на маршрутах вар'іруецца ад 6,5 да 13 км.

У пачатак і на фініш кожнага з маршрутаў патрабуецца пад'езд групы на грамадскім, школьным або асабістым транспарце.

Дадзеныя маршруты разлічаны на ўдзельнікаў з 10 гадоў у перыяд з красавіка па кастрычнік. Прапанаваны матэрыял можна трансфарміраваць для правядзення веласіпедных паходаў.

Задачы любога з паходаў:

- арганізаваць паўнацэнны адпачынак у прыродным асяроддзі;
- пашырыць кругагляд удзельнікаў, іх веды па геаграфіі, біялогіі, беларускай літаратуры, гісторыі, мастацтву;
- пазнаёміцца з помнікамі архітэктуры, прыроды Дзяржынскага раёна;
- папулярызаваць і развіваць дзіцяча-юнацкі турызм.

Кожны з 7 маршрутаў паходаў прадстаўлены блокамі:

- маршрут, яго даўжыня;
- інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках па днях паходу і ўказанне месца начлегу, закупкі прадуктаў харчавання;
- фотаздымкі аб'ектаў, маршрут на карце.

## Паход па маршруту
## “Цэнтр экалагічнага турызму “Станькава” – в.Станькава”

Даўжыня маршруту – 6,5 км

**Інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках маршруту**

**1-ы дзень паходу**

**Цэнтр экалагічнага турызму “Станькава”**
- Ваенна-гістарычны комплекс “Партызанскі лагер”.
Можна пазнаёміцца з бытам партызан.
- Ваенна – гістарычны комплекс “Мінскі ўмацаваны раён”. Рэканструіруецца жыццё пагранічнай заставы перыяду 1921 – 1941 гадоў.
- Заасад. У ім прадстаўлена больш за 40 відаў птушак і млекакормячых розных парод.

**Станькава**
- Мемарыяльны комплекс Героя Савецкага Саюза Марата Казея, брацкая магіла землякоў.
- Свята-Мікалаеўская царква. Размешчана на левым беразе р.Рапуса. Пабудавана ў 1858 г. уладальнікам маёнтка графам Эмерыкам Чапскім пры дапамозе прыхаджан.

**Начлег**
Пакоі турбазы дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Дзяржынскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства”.
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазін в.Станькава

**2-гі дзень паходу**

**Станькава**
- Краязнаўчы музей размешчаны ў памяшканні ДУА “Станькаўская СШ імя Марата Казея”.
- Сядзібна-паркавы ансамбль. Помнік садова-паркавага мастацтва XIX ст. Належыў графу Чапскаму.
- Музейныя пакоі “Ваенная гісторыя Беларусі” ДУДА “Дзяржынскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства”
- Наземны комплекс кіравання.

## Фотаздымкі гісторыка-культурных помнікаў, аб’ектаў прыроды


















# Паход па маршруту
# ч.п. Энергетык – Філіял БДТУ “Негарэльскі вучэбна-вопытны лясгас” (в.Гарадзішча) – ч.п.Асіна

Даўжыня маршруту – 8,9 км

**Інфармацыя аб аб’ектах прыроды на маршруце**

**1-ы дзень паходу**

**в.Гарадзішча**
- Негарэльскі вучэбна-вопытны лясгас. Можна прайсціся па тэрыторыі гадавальніка, адкуль пачынаецца папаўненне лясных багаццяў краіны.
- Музей “Дом прыроды”. У музеі налічваецца больш 100 экспанатаў, якія прадстаўлены большасцю відаў жывёл і птушак, распаўсюджаных у беларускіх лясах.
- Батанічны сад. Экалагічная сцяжынка “Казка Негарэльскага лесу”. Тут расце больш за 650 відаў драўняных і кустовых парод. Спалучаецца прыгажосць прыроды і беларускі фальклор, міфы, паданні, павер’і.

**Начлег**
Недалёка абсталявана стаянка для турыстаў і адпачываючых.
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазін аг.Энергетык

**2-гі дзень паходу**

Прагулка лесам да чыгуначнага прыпынку.

**Фотаздымкі аб’ектаў прыроды**









ЭКАЛАГІЧНАЯ СЦЕЖКА
«Казка Негарэльскага лесу»
ECOLOGICAL TRAIL
«The Tale of the Niebarelaje forest»
Гісторыя стварэння
Батанічнага саду БДТУ
The Origin of the Botanical
Garden of the BSTU








- пачатак маршруту
- канец маршруту
- аб'екты агляду
- месца начоўкі
Клочки
Клачкі
E30
Городище
Гарадзішча

## Паход па маршруту
## в.Воўка – в.Бакінава – в.Касілавічы

Даўжыня маршруту – 8,6 км

### Інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках маршруту

**1-ы дзень паходу**

**Воўка**
- Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну;
- Валун з надпісам аб тым, што на полі побач праходзілі кровапралітныя абарончыя баі супраць нямецкіх акупантаў у чэрвені-ліпені 1941 года.

**Лес каля в.Бакінава**
- У Вялікую Айчынную вайну ў Бакінаўскім лесе знаходзіўся штаб 125-га партызанскага атрада імя Сталіна – першага партызанскага атрада ў Дзяржынскім раёне. Месца размяшчэнне атрада абазначана валуном.

**Начлег**
На беразе крэйдавага кар'ера каля в.Бакінава ёсць месца прыдатнае для разбіцця бівака
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазіны г.Дзяржынска

**2-гі дзень паходу**

Адпачынак на беразе вадаёма



# Паход па маршруту
# в.Вялікае Сяло – сядзібна-паркавы комплекс
# “Парк гісторыі Сула” – аг.Рубяжэвічы
# (Стаўбцоўскі р-н)

Даўжыня маршруту – 9,5 км

**Інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках маршруту**

**1-ы дзень паходу**

**Вялікае Сяло**
- Гісторыка-краязнаўчы музей “Азбука роднай гісторыі і прыроды” ДУА “Вялікасельская БШ”

**Сядзібна-паркавы комплекс “Парк гісторыі Сула” (Стаўбцоўскі раён)**
Тэматычныя пляцоўкі:
- Мегалітычная культура;
- Стаянка першабытнага чалавека;
- Пляцоўка славянскіх культаў;
- Прыстань варагаў і падарожжа на «дракары»;
- Беларусь – краіна замкаў;
- Беларуская шляхта;
- Беларускае мястэчка;
- Сядзібнае жыццё.

**Начлег**
Каля комплексу ў наяўнасці прыдатныя мясціны для размяшчэння з палаткамі.
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазін в.Вялікае Сяло

**2-гі дзень паходу**

**Рубяжэвічы (Стаўбцоўскі раён)**
- Касцёл Святога Іосіфа. Пабудаваны ў 1906-1910 гг. У неагатычным стылі.
- Валуновая кампазіцыя “Памяць у камені” знаходзіцца побач з касцёлам, зроблена ў 2006 г. у сувязі са 100-годдзем пачатку будаўніцтва касцёла.

# Фотаздымкі гісторыка-культурных помнікаў
















# Паход па маршруту
# аг.Скірмантава – в.Скарабагатаўшчына – аг.Волма

Даўжыня маршруту – 13 км

## Інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках маршруту

**1-ы дзень паходу**

**Скірмантава**
- Гара Дзяржынская (да 1958 г. – Святая гара). Вышэйшая кропка Мінскага ўзвышша і Беларусі (346 м над узроўнем мора). Мае выгляд пакатага ўзвышша, складзенага марэнай.
- Архітэктурная кампазіцыя “Сцяг Радзімы”
- Краязнаўчы музей “Скірмантава” ДУА “Скірмантаўская СШ”

**Начлег**
На абсталяванай стаянцы сажалкі Кавальцы
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазін аг.Скірмантава

**2-гі дзень паходу**

**Волма**
- Успенскі касцёл. Размяшчаецца на ўзгорку ў гістарычным цэнтры вёскі. Быў пабудаваны ў 1851 г. У 2000 – 2003 гг. адноўлены.
- Сядзіба Ваньковічаў. Размешчана на беразе ракі Волма на ўскрайку в.Волма пры ўездзе з боку Дзяржынска. З’яўляецца помнікам палацава-сядзібнай архітэктуры класіцызму. Зараз тут размяшчаецца філіял “Рэсурсны цэнтр ЭкаТэхнаПарк – Волма” ўстановы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі”.
- Музей быту. Размешчаны ў будынку школы. Быў адкрыты ў 1993 годзе.

**Фотаздымкі гісторыка-культурных помнікаў**














Свидовщина
Свідоўшчына
Ковшово
Каўшова
Тюхаи
Цюхаі
H-8243
Денисовщина
Дзянісаўшчына

# Паход па маршруту
# в.Крыштафова- гідралагічны помнік рэспубліканскага значэння “Юцкоўскія крыніцы” – в.Павуссе – аг.Вялікія Навасёлкі

Даўжыня маршруту – 11 км

**Інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках маршруту**

**1-ы дзень паходу**

**Юцкі**
- Гідралагічны помнік рэспубліканскага значэння “Юцкоўскія крыніцы”.

**Начлег**
На паляне недалёка ад крыніц.
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазін аг.Дворышча

**2-гі дзень паходу**

**Вялікія Навасёлкі**
- Палац Кастравіціх пабудаваны ў 1820-м годзе ў стылі класіцызму. Зараз у ім размяшчаецца мясцовая бальніца.
- Стайня, пабудаваная Здзяхоўскімі, узведзена ў два паверхі з чырвонай цэглы ў XIX стагоддзі.
- Гісторыка-краязнаўчы музей, які размешчаны ў будынку ДУА «Навасёлкаўская СШ». Адкрыты ў 1969 годзе.

**Фотаздымкі гісторыка-культурных помнікаў, аб’ектаў прыроды**












## Паход па маршруту в.Дабрынёва – аг.Данілавічы – в.Радзіма – мемарыяльны комплекс “Літавец”

Даўжыня маршруту – 13 км

### Інфармацыя аб гісторыка-культурных помніках маршруту

**1-ы дзень паходу**

**Дабрынёва**
- Капліца – помнік архітэктуры драўлянага дойлідства 1-ай паловы XIX ст.

**Данілавічы**
- На тэрыторыі вёскі шмат помнікаў і абеліскаў, дзе пахаваны воіны і мясцовыя жыхары, якія загінулі пад час падзей Вялікай Айчыннай вайны.

**Начлег**
На лясной паляне непадалёк ад крыніцы за в.Радзіма.
**Закупка прадуктаў харчавання**
Магазін аг.Данілавічы
**2-гі дзень паходу**

**Сёстры Хатыні: Любажанка – Літавец**
- Любажанка – братская магіла ахвяр фашызму і месца спаленай вёскі. У 1957 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.
- Літавец – мемарыяльны комплекс ландшафтнага тыпу адкрыты ў 1986 г. Створаны на месце спаленай 14 студзеня 1943 года вёскі Літавец. Прадстаўлены радам сюжэтных барэльефаў.
**Фотаздымкі гісторыка-культурных помнікаў**
















## Аб’екты Дзяржынскага раёна
## для арганізацыі экскурсій у рамках адукацыйна

| | Установа | Графік працы | № тэлефона |
|---|---|---|---|
| **г.Дзяржынск** | | | |
| 1. | Установа адукацыі “Дзяржынскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей” | аўторак-нядзеля 10.00 - 19.00. | 801716 52457 |
| 2. | Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў | панядзелак – пятніца 10.00 – 16.00 абед 12.00 -13.00 | 801716 52001 |
| 3. | “Музей Боявой Славы” дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія г.Дзяржынска” | Панядзелак - субота Час па ўзгадненню | 801716 76686 |
| 4. | Музей «Городы-героі» дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №4 г.Дзяржынска” | Панядзелак - субота Час па ўзгадненню | 801716 61770 |
| 5. | Гістарычныя аб’екты горада па маршруту “вул.Ленінградская – пл.Дзяржынскага – вул.Першамайская” | Круглы год | |
| **в.Станькава** | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 6. | Дзяржаўная ўстанова “Дзяржынскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці” | панядзелак-пятніца 8.30 — 17.30 | 801716 24284 |
| 7. | Цэнтр экалагічнага турызму “Станькава”<br>- заасад;<br>- ваенна-гістарычны комплекс «Партызанскі лагер» | серада – нядзеля 8.00 – 17.00 | 801716 26690 |
| 8. | Ваенна-гістарычны комплекс “Старая мяжа” - Філіял Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | серада – нядзеля 9.00 – 18.00 | +375(17) 2030792,<br><br>+375(29) 1440792 |
| 9. | Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Дзяржынскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства”<br>- музейныя пакоі “Ваенная гісторыя Беларусі”;<br>- сядзібна-паркованы комплекс Чапскіх;<br>- мемарыяльны комплекс Марата Казея;<br>-арганізацыя наведвання Цэнтракіравання касмічнымі палётамі. | Панядзелак - субота Час па ўзгадненню | 801716 73374 |
| 10. | Музей дзяржаўнай установы адукацыі “Станькаўская сярэдняя школа імя Марата Казея” | Панядзелак - субота Час па ўзгадненню | 801716 95866 |
| **аг.Данілавічы** | | | |
| 11. | Мемарыяльны комплекс “Літавец” | вясна – восень | 801716 44123 |
| **г.п.Негарэлае** | | | |
| 12. | Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Негарэльская базавая школа №2” | Аглядавая экскурсія па г.п.Негарэлае | 801716 59358 |
| 13. | Філіял БДТУ “Негарэльскі вучэбна-вопытны лясгас” (музей “Дом прыроды”, экалагічная сцежка “Казка Негарэльскага лесу”) | панядзелак – чацвер 8.00 – 17.00<br>пятніца 8.00 – 15.45 | 801716 91165 |
| **аг.Вялікае Сяло** | | | |
| 14. | Музей “Азбука роднай гісторыі і прыроды” дзяржаўнай установы | Панядзелак - субота Час па ўзгадненню | 801716 92085 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | адукацыі “Вялікасельская базавая школа” | | |
| **аг.Вялікія Навасёлкі** | | | |
| 15. | Музей “Гісторыя вёскі Вялікія Навасёлкі” дзяржаўнай установы адукацыі “Навасёлкашская сярэдняя школа” | Панядзелак - субота<br>Час па ўзгадненню | 801716<br>91929 |
| 16. | Сядзіба Кастравіцкіх | Круглы год | |
| **аг.Юцкі** | | | |
| 17. | Музей “Рамёствы Беларусі” дзяржаўнай установы адукацыі “Дзямідавіцкая базавая школа” | Панядзелак - субота<br>Час па ўзгадненню | 801716<br>93975 |
| 18. | Гідралагічны помнік рэспубліканскага значэння “Юцкоўскія крыніцы” | вясна - восень | |
| **аг.Скірмантава** | | | |
| 19. | Архітэктырная кампазіцыя “Сцяг Радзімы” | Круглы год | |
| 20. | Музей “Скірмантава” дзяржаўнай установы адукацыі “Скірмантаўская сярэдняя школа” | Панядзелак - субота<br>Час па ўзгадненню | 801716<br>73864 |
| **аг.Волма** | | | |
| 21. | “Музей быту” дзяржаўнай установы адукацыі “Валмянская базавая школа” | Панядзелак - субота<br>Час па ўзгадненню | 801716<br>33646 |
| 22. | Рэсурсны цэнтр “ЭкаТэхнаПарк - Волма” | Панядзелак - пятніца<br>8.30 – 17.00 | 801716<br>74822 |